НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ
Камісія па нацыянальнай бяспецы
220010, г. Мінск, Дом Урада,
тэл./факс (017) 222-63-35, факс (017) 227-37-84
E-mail: nacby@house.gov.by

НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ПАЛАТА ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ
Комиссия по национальной безопасности
220010, г. Минск, Дом Правительства,
тел./факс (017) 222-63-35, факс (017) 227-37-84
E-mail: nacby@house.gov.by

24.12.2009 № 05-05/2244-66

на № __________ от ________________

220012, г. Мінск, пр-т
Незалежнасці, д. 78 А, кв. 48
Бяляцкаму А.В.

Паважаны Аляксандр Віктаравіч!

Ваш зварот у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь наконт адмены ў Беларусі пакарання смерцю разгледжаны ў Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.

Як Вам вядома, летам гэтага года Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь вярнулі статус спецыяльна запрошанага ў ПАСЕ на адзін год, але пры ўмове ўвядзення мараторыя на пакаранне смерцю. Яго адмена таксама з'яўляецца адной з 12 умоў Еўрасаюза, пастаўленых Беларусі для працягу далейшага дыялогу. Гэта пытанне зноў узнікала ў ходзе нядаўняга візіту ў Мінск кіраўніка генеральнага дырэктарата Савета Еўропы па дэмакратыі і палітычных пытаннях Жан-Луі Ларана.

Паважаючы думку Еўрасаюза, мы не можам кіравацца толькі ёю ў вырашэнні такіх важных унутраных пытанняў, як адмена пакарання смерцю. Было б прасцей, калі б такое рашэнне ляжала ў чыста прававой плоскасці. Але ў тым і справа, што для нас яно мае вялікае маральна-палітычнае значэнне. Па сутнасці, гэта пытанне даверу народа да ўлады, і дэпутаты не маюць права ігнараваць вынікі рэферэндуму 1996 года. А тады ж за пакаранне смерцю выказалася пераважная большасць. Так,

З. 3276.

сёння карціна ўжо не здаецца такой адназначнай. З часу правядзення рэферэндуму ў краіне вельмі многае змянілася: стабілізавалася крымінагенная сітуацыя, палепшылася сацыяльна-эканамічнае становішча. Істотныя змяненні адбыліся ў тым ліку і ў судовай практыцы. Паводле вядомай інфармацыі, у 1996 годзе да смяротнай кары былі прыгавораны 46 чалавек, а ў 2009 годзе — толькі 2, або ў 23 разы менш. Гэта тлумачыцца тым, што з 1999 года з'явілася альтэрнатыва пакаранню смерцю — пажыццёвае зняволенне. Акрамя таго, скарацілася колькасць артыкулаў Крымінальнага кодэкса, у якіх прадугледжана выключная мера пакарання. Суды сталі ўсё радзей прыгаворваць як да смяротнай кары, так і да пажыццёвага зняволення.

Такім чынам, Беларусь непасрэдна падышла да таго, каб пачаць падрабязна, празрыста і шырока абмяркоўваць у грамадстве пытанне аб адмене пакарання смерцю. А для гэтага нам, дэпутатам, неабходны дыялог з народам. Ён можа праходзіць у розных формах, але мы найперш вывучым магчымасць правядзення парламенцкіх слуханняў па гэтай тэме. Думаю, яны дазволяць аб'ектыўна ацаніць сітуацыю і гатоўнасць грамадства па-новаму зірнуць на гэту праблему.

Старшыня Пастаяннай камісіі
па нацыянальнай бяспецы В.А.Гумінскі